# РАЗДЕЛ 1
# ИСТОРИЧЕСКИЕ, ФИЛОСОФСКИЕ НАУКИ, ЯЗЫКОЗНАНИЕ

## *1.1 Социально-гуманитарные дисциплины*

УДК 008(476)"15/19"

### РЭВЕРСІЎНЫЯ КРОПКІ РАЗВІЦЦЯ ІНТЭЛЕКТУАЛЬНАЙ КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСІ Ў ЭПОХУ НОВАГА ЧАСУ

***Хаданёнак В.М., к.г.н.***

*Віцебскі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт,*
*г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь*

Рэферат. *У артыкуле разглядаюцца паваротныя моманты і асноўныя лініі эвалюцыі інтэлектуальнай культуры Беларусі ў XVI – пачатку XX стагоддзя. Асаблівая ўвага надаецца характару і накірункам зменаў у мадэлях культурнага развіцця.*

Ключавыя словы: інтэлектуальная культура, Новы час, менталітэт, светасузіранне, культурны сімбіёз, унія.

Тэрмін "інтэлектуальная культура" да гэтага часу не мае выразна акрэсленай дэфініцыі. Падыходы да яго тлумачэння у першую чаргу з-за трансдысцыплінарнасці, істотным чынам адрозніваюцца ў розных даследчыкаў. Да разумення спецыфікі інтэлектуальнай культуры тым ці ншым чынам звярталіся такія навукоўцы, як О. Шпэнглер, А. Тойнбі, Дз. С. Ліхачоў, Ж. Ле Гофф, У. Эка, К. Ясперс і інш. Інстытут філасофіі НАН Беларусі, пачынаючы з 2014 г., праводзіць штогадовую міжнародную навуковую канферэнцыю "Інтэлектуальная культура Беларусі".

Інтэлектуальная культура Беларусі прайшла ў сваім развіцці доўгі, шмат у чым пакутны і цярністы шлях. Яна заўжды вылучалася істотнай дынамікай, бо на яе станаўленне ўплывалі як палітычныя, так і сацыяльна-эканамічныя падзеі, што адбываліся на нашай тэрыторыі. Паспрабуем абазначыць асноўныя рэверсіўныя кропкі ў развіцці інтэлектуальнай культуры Беларусі ў перыяд Новага часу (XVI – пачатак XX стст.).

Першай рэверсіўнай кропкай у развіцці інтэлектуальнай культуры Беларусі ў перыяд Новага часу, як нам бачыцца, сталася заключэнне ў 1569 г. Люблінскай уніі. У выніку Вялікае княства Літоўскай аб'ядналася з каралеўствам Польскім ў супольную дзяржаву – Рэч Паспалітую. Калі да сярэдзіны XVI ст. культура беларускіх земляў знаходзілася пераважна ў арбіце "ўсходняй" або "візантыйскай" сістэмы каардынат, то пасля ліпеня 1569 г. назіраецца істотны крэн ў бок заходнееўрапейскага культурнага асяродка. Такія змены не выклікалі заняпад "візантыйскай" традыцыі на нашых землях, а прывялі да арганічнага суіснавання дзвюх мадэляў культурнага існавання. Беларускае грамадства аказалася ментальна падрыхтаваным да такіх метамарфозаў, што зрабіла яго больш схільным да дыялогу розных парадыгмаў светасузірання. І рэч не толькі і не столькі ў з'яўленні новых "заходне-рэнесансных элементаў" у нашай культурнай прасторы. Сярод якіх можна вылучыць станаўленне гуманістычнага светапогляду і свецкай літаратуры, развіццё кнігадрукавання, з'яўленне палацава-паркавых комплексаў, пашырэнне партрэтнага жывапісу, пачатак дзейнасці школьных тэатраў і інш. Беларусы як народ, які ўвесь час жыў на памежжы дзвюх цывілізацый, "усходняй" і "заходняй", цалкам спакойна ўспрыняў культурны сімбіёз дзвюх мадэляў інтэлектуальна-культурнага развіцця.

Невядома як і наколькі доўга б цягнуўся перыяд суіснавання дзвюх парадыгмаў культурнага развіцця на нашай тэрыторыі, калі б не змены ў рэлігійнай сітуацыі на беларускіх землях. Другой рэверсіўнай кропкай у развіцці інтэлектуальнай культуры беларусаў у XVI – пачатку XX стст. мы вызначаем заключэнне Берасцейскай царкоўнай уніі ў кастрычніку 1596 г. Як нам падаецца, гэта прывяло не столькі да ўмацавання "рымалацінскіх" або заходніх традыцый ў рэлігійнай сферы, колькі да выкрышталізоўвання разумення адметнасці беларускай культуры і імкнення знайсці ёю сваё месца не ў

залежнасці ад Масквы і Варшавы, а побач з імі і на роўных умовах. Пра гэта яскрава сведчыць дзейнасць Мялеція Сматрыцкага, Васіля Цяпінскага, Іпацiя Пацея і іншых прадстаўнікоў рэлігійнай і філасофскай думкі. С. А. Падокшын сцвярджае, што “ў светапоглядзе і дзейнасці І. Пацея наглядаюцца даволі выразныя элементы нацыянальнай самасвядомасці, імкненне да развіцця айчыннага багаслоўя, кнігадрукавання, адукацыі на роднай мове, жаданне дбаць “на продкі свае”” [1, с. 5]. Мялеці Сматрыцкі надрукаваў паміж 1618 і 1619 гг. у Іўі “Граматыкі славенскія правільная сінтагма”. У сваім творы ён хацеў паказаць, што “… народная гаворка – гэта не толькі штучнае злучэнне асобных мясцовых дыялектаў, але і рэгулярная, заснаваная на правілах граматыкі літаратурная мова, што падыходзіла для навуковага пазнання свету і нічым не саступала латыні ці старажытнагрэчаскай мове [2, с. 609]. Васіль Цяпінскі ў сваім родавым маёнтку выдаў перакладзенае ім на беларускую мову “Евангелле”, а сам выступаў за неабходнасць асветніцкай дзейнасці сярод народа і за ўмацаванне пазіцый беларускай мовы.

Трэцяй рэверсіўнай кропкай мы вызначаем перыяд сярэдзіны XVII ст. на нашых землях, які ў цэлага шэрага даследчыкаў атрымаў назву “патоп”. На працягу 20 гадоў беларускія землі апынуліся ў віры крывавых войнаў. Казацка-сялянская вайна 1648–1651 гг., вайна Расіі з Рэччу Паспалітай 1654–1667 гг., прывялі да таго, што насельніцтва беларускіх земляў скарацілася больш чым на палову. З 2,9 млн чалавек засталося толькі 1,4 млн, асабліва пацярпелі Мсціслаўскае, Віцебскае, Полацкае і Мінскае ваяводствы [3, с. 200]. Але істотным вынікам гэтых ваенных канфліктаў стала і тое, што беларускі народ стаў грамадствам з не поўнай сацыяльнай структурай. Бо страты гарадскога насельніцтва ў шэрагу паветаў перавышалі 90 % [4, с., 139]. Месцічы вымушаны былі назаўсёды пакідаць зруйнаваныя гарады і шукаць паратунку ў вёсцы, дзе можна было лягчэй выжыць. Як след, беларускі народ пачаў ператварацца ў народ вясковы і “сялянскі”, а ўрбаністычная гарадская культура паступова пачала адыходзіць на другі план.

Чацвёртай паваротнай кропкай ў развіцці нашай культуры мы вызначаем нават не ўваходжанне беларускіх земляў у склад Расійскай імперыі пасля падзелаў 1772, 1793 і 1795 гг., а наступствы, якія выклікала падаўленне паўстання 1830–1831 гг., для беларускай інтэлектуальнай культуры. Адбыліся змены ў сістэме права (скасаванне дзеяння статутаў ВКЛ), быў зачынены Віленскі ўніверсітэт, ліквідавана ўніяцкая царква, накладвалася забарона афіцыйна выкарыстоўваць тэхрміны “Беларусь” і “Літва”. Адбываліся змены ў сістэме навучання, вонкавым абліччы праваслаўных храмаў. Назіралася не мірнае суіснаванне, а спроба канчаткова выціснуць адзін культурны элемент, другім. Фактычна “… беларусаў у складзе Расіі не прызнавалі самастойным народам. Іх не заўважалі, лічылі або палякамі, або рускімі” [5, с. 72].

Апошняй рэверсіўнай кропкай ў развіцці беларускай інтэлектуальнай культуры ў перыяд Новага часу мы вызначаем унікальны і не да канца асэнсаваны ўздым і своеасаблівае нацыянальна-культурнае абуджэнне ў канцы XIX – пачатку XX стагоддзя. На літаратурным небасхіле заззялі зоркі Ф. Багушэвіча і В. Дунін-Марцінкевіча, Я. Купалы і Я. Коласа, А. Пашкевіч і М. Багдановіча, А. Гаруна і С. Палуяна. Сапраўднымі адкрыццямі ў выяўленчым мастацтве сталі постаці К. Альхімовіча і Ф. Дмахоўскага, А. Гараўскага і Н. Сілівановіча, Ф. Рушчыца і В. Бялыніцкага-Бірулі. Нягледзячы на цэнзурныя забароны выходзілі газеты і часопісы на беларускай мове: “Наша доля”, “Наша ніва”, “Гоман”, “Дзянніца”, “Маладая Беларусь”, “Саха”, “Лучынка”, “Раніца”. Вялікім поспехам у насельніцтва карыстаўся тэатр Ігната Буйніцкага. У галіне музычнай культуры шчыравалі К. Кімант, С. Шымкус, Л. Рагоўскі. У Віцебску, Мінску, Брэсце, Гомелі, Магілёве і іншых гарадах арганізоўваліся педагагічныя, навуковыя і медыцынскія таварыствы. Гісторыя, культура і беларуская мова сталі аб’ектамі пільнага вывучэння такімі даследчыкамі, як М. В. Доўнар-Запольскі, Я. Карскі, Е. Раманаў, А. Сержпутоўскі, М. Нікіфароўскі.

Такім чынам, можна прыйсці да высновы, што пасля праходжання рэверсіўных кропак ў развіцці інтэлектуальнай культуры Беларусі ў перыяд Новага часу, нас чакаў не заняпад і крызіс у асобных яе галінах, а перш за ўсё своеасаблівая трансфармацыя яе фундаментальных элементаў, якія не выключалі, а толькі з розным узроўнем паспяховасці ўзаемадапаўнялі адзін аднаго.

Спіс выкарыстаных крыніц

1. Падокшын, С. А. Іпацій Пацей: Царкоўны дзеяч, мысліцель, пісьменнік, на пераломе культурна-гістарычных эпох / С. А. Падокшын. – Мінск : Бел. навука, 2001. – 118 с.
2. Гісторыя Беларусі: у 6 т. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск :

Экаперспектива. – Т. 2 : Беларусь у перыяд Вялікага Княства Літоўскага / Ю. Бохан [ і інш.]. – 2008. – 688 с.
3. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. / рэдкал.: Б. І. Сачанка (гал. рэд.) [і інш]. – Мінск : БелЭн. – Т. 2: Беліцк – Гімн. – 1994. – 537 с.
4. Сагановіч, Г. Невядомая вайна / Г. Сагановіч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1995. – 144 с.
5. Шыбека, З. Нарыс гісторыі Беларусі (1795–2002) / З. Шыбека. – Мінск : "Энцыклапедыкс", 2003. – 490 с.

УДК 37.013(091)

# СИСТЕМА ШКОЛЬНОГО ОБРАЗОВАНИЯ ВИТЕБЩИНЫ В ПЕРИОД РЕЧИ ПОСПОЛИТОЙ

***Лученкова Е.С.[1], к.и.н., доц., Вечер Л.С.[2], к.и.н., доц.***

*[1]Витебский государственный технологический университет, г. Витебск, Республика Беларусь*

*[2]Академия Управления при Президенте Республики Беларусь, г. Минск, Республика Беларусь*

Реферат. *В статье предпринята попытка проследить становление системы школьного образования Витебщины в период Речи Посполитой. После подписания Люблинской унии (1569 г.) вследствие появления нового государства – Речи Посполитой – на территории Витебщины функционировали школы различных направлений. Что представляло возможность выбора образовательных форм и средств, а следовательно повышало уровень образования, который давала школа.*

Ключевые слова: система школьного образования, Речь Посполитая, Витебщина, протестантские школы, братские школы, иезуитские школы, униатские школы.

Система школьного образования Витебщины XVI–XVII вв. неразрывно связана с историей и политикой Речи Посполитой.

В 1569 г. была подписана Люблинская уния, в соответствии с которой Польша и ВКЛ объединились в новое государство – Речь Посполитую. Основные события в истории этого государства (Брестская церковная уния, Реформация и Контрреформация) оказывали на судьбу белорусских земель самое непосредственное влияние, в том числе на систему школьного образования.

Во второй половине XVI–XVII вв. на белорусских землях существовали разные по идейной направленности (конфессиональной принадлежности), содержанию, организационным формам, методам работы школы. Самыми известными школами в этот период были: протестантские, православные братские, католические (представленные иезуитской системой школьного образования), униатские (после принятия Брестской унии 1596 г.).

Первые известия о протестантских общинах на Беларуси относятся к началу XVI века. В 70-е годы XVI века они появились и на Витебщине (в Витебске, Полоцке, Глубоком). При каждой общине, как правило, имелась церковь, школа, госпиталь, а при некоторых и типография. В школах обучались дети шляхты и горожан. Протестантские школы носили конфессионный характер и основы христианского вероучения были в них важнейшим учебным предметом. Заслугой протестантских школ следует признать широкое использование в начальном обучении родного языка.

В Беларуси существовали протестантские школы разных направлений: лютеранские, кальвинистские, арианские. Большинство протестантов Витебщины приняли кальвинизм. Первое училище кальвинистов было основано в Витебске во 2-й половине XVI в. в Верхнем замке рядом с Благовещенской церковью. Ими были построены молитвенный дом, больница, школа. Более подробной информации о деятельности этой школы не сохранилось.

В 60-е годы XVI в. в белорусском протестантском движении появилось новое течение – арианство. По инициативе арианских общин на территории Беларуси, в том числе в Витебске и Глубоком была открыта целая сеть арианских школ. Эти школы были двух